ПАДЗЕЯ

# НА ХВАЛІ АДЗІНСТВА

**21 красавіка ў Гродзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Ф. Карскага было шматлюдна. Тут адбылася прэзентацыя афіцыйнага друкаванага органа Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі» № 7. Знаёмства са свежым нумарам перыядычнага выдання прайшло з удзелам яго аўтараў.**

Каб сустрэцца вочы ў вочы са стваральнікамі сучаснай айчыннай літаратуры, у галоўнай бібліятэцы вобласці сабраліся аматары мастацкага слова рознага ўзросту – ветэраны працы і моладзь – вучні сярэдняй школы № 3 і гімназіі № 9 г. Гродна, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, работнікі культуры і адукацыі.

Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі шануе традыцыі выдання літаратурных альманахаў на Беларусі. Пра гэта і пра тое, як ствараўся свежы, сёмы нумар, распавяла лідар арганізацыі, старшыня ГрАА СПБ Людміла Антонаўна Кебіч *(на фота).*





Адметнасць гродзенскіх альманахаў у тым, што на іх старонках заўсёды знаходзіцца месца для сяброў Гродзеншчыны літаратурнай і нашай пісьменніцкай арганізацыі. Не стаў выключэннем і нумар сем. З чытаннем уласных твораў з новага альманаха ў праграме літаратурнай вечарыны прынялі ўдзел гродзенскія паэты, празаікі, дзіцячыя пісьменнікі і не толькі. Сярод іх: Ганна Скаржынская-Савіцкая; Андрэй Татур; Ірына Фамянкова; Кацярына Ігнацюк; Браніслаў Ермашкевіч; Руслан Казлоўскі; Таццяна Лашук; публіцыст Уладзімір Ягорычаў; беларускія паэты з Ваўкавышчыны Мікалай Іваноўскі і Віктар Курловіч; украінскі паэт з Гродна Рыгор Гармаш; Ліна Багданава; Дзмітрый Радзівончык; Святлана Тарасава; Людміла Шаўчэнка; Таццяна Сучкова; літаратурны крытык Аліна Сабуць. Прагучалі аўтарскія музычныя кампазіцыі ў выкананні Андрэя Татура (*калі ласка, глядзіце фота ніжэй*).




ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
ПРЭЗЕНТАЦЫЯ АБЛАСНОГА
ЛІТАРАТУРНАГА АЛЬМАНАХА
«НА НЁМАНСКАЙ ХВАЛІ»№7
да Міжнароднага
дня кнігі і
аўтарскага права


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
МУЗЕИ БЕЛАРУСИ
МЫ ЭТОЙ ПАМЯТИ ВЕРНЫ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
МУЗЕИ БЕЛАРУСИ
МЫ ЭТОЙ ПАМЯТИ ВЕРНЫ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


BELARUS
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ -
СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ
БРЕСТСКАЯ КРЕПОСТЬ


ПРЭЗЕНТАЦЫЯ АБЛАСНОГА
ЛІТАРАТУРНАГА АЛЬМАНАХА
НЁМАНСКАЙ ХВАЛІ»№7
да Міжнароднага
дня кнігі і
аўтарскага права


Каларыт беларускай культуры
Славутыя мясціны Беларусі
Мы этой памяти верны
Брестская крепость


BELARUS


BELARUS
Славутыя мясціны Беларусі


ПРЭЗЕ
ЛІТАРАТ
«НА НЁМАН












У фінале дзеі асобнік выдання быў уручаны галоўнай бібліятэцы вобласці, дзе з яго зместам цяпер можа азнаёміцца кожны, хто пажадае. Пісьменнікі – людзі вельмі занятыя. Можна сказаць, што ў прысутных была сапраўды ўнікальная магчымасць убачыць разам і пачуць без малога два дзясяткі людзей, якія сёння імкнуцца не толькі берагчы, але і працягваць літаратурныя традыцыі, творцаў, якія жывуць і працуюць побач, па суседстве са сваімі чытачамі.

Нельга недаацэньваць ролю мастацтва ў аб'яднанні абсалютна розных людзей, чыё слова ўжо шмат гадоў напаўняе наш свет святлом думкі і цяплом пачуцця. Прэзентацыя сёмага нумара абласнога літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі» пацвердзіла, што сёння літаратура – гэта з'ява не масавая. Тым не менш, нягледзячы ні на што цікавасць да яе застаецца.

***

*Аўтарскі калектыў абласнога  літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі» № 7 выказвае шчырую ўдзячнасць калектыву СВК  «Свіслач» і асабіста яго старшыні Васілю Мікалаевічу Густыру за фінансавую дапамогу ў выданні альманаха.*

***

*Аўтарскі калектыў абласнога  літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі» № 7 выказвае шчырую ўдзячнасць адказнаму за выпуск рэдактару Людміле Антонаўне Кебіч і рэдактару Ганне Іосіфаўне Скаржынскай-Савіцкай за актыўную працу па падрыхтоўцы выдання.*

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**




**Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я. Ф. Карскага. 21 красавіка 2022 года**